## 15 ТАПАЛОГІЯ І ГЕНДАРНАСЦЬ ЖАНОЧЫХ ВОБРАЗАЎ У РАМАНАХ В. КОЎТУН

1 Параўнальная характарыстыка вобраза Цёткі (раман “Крыж міласэрнасці”) і вобраза Еўфрасінні (раман “Пакліканыя”)

2 Тапалогія і гендарнасць другарадных жаночых вобразаў у раманах пісьменніцы.

3 Жанчына і творчасць: мастацкае вырашэнне пытання.

### 1 Параўнальная характарыстыка вобраза Цёткі (раман “Крыж міласэрнасці”) і вобраза Еўфрасінні (раман “Пакліканыя”)

Пры разглядзе гэтага пытання ўвага будзе звернута перш за ўсё на вобразы Цёткі і Еўфрасінні. Яны падрабязна прааналізаваны ў папярэдніх тэмах, таму нам дастаткова толькі зрабіць высновы наконт іх тапалагічнасці: прыняць такую іх якасць ці аспрэчыць. Да вобраза Вольгі мы будзем звяртацца ў той ступені, у якой ён будзе дапамагаць нам выяўляць тапалагічныя рысы галоўных гераінь раманаў «Крыж міласэрнасці» і «Пакліканыя».

Не залежна ад таго, наколькі аддалены гераіні ў часе паміж сабой (і ад пісьменніцы таксама), наколькі розны іх узрост і занятак, у іх характарах сапраўды можна выявіць мноства тапалагічных рыс. Найперш, гістарычна, абедзве яны (Цётка і Еўфрасіння) асобы неардынарныя, кожная ў сваім часе. Гэта жанчыны, якія здолелі выйсці за межы тагачасных стэрэатыпаў жаноцкасці і тым застацца ў гісторыі нашай культуры ўвогуле і літаратуры ў прыватнасці. Блізкія яны сваім унутраным светам, які шырока прадстаўлены ў раманах. Аднак і ўчынкі іх часта *падобныя* і выкліканы *падобнымі* абставінамі, хаця мэты гэтых учынкаў розныя. Так, Цётка едзе ў калонію для пракажоных, каб не толькі быць карыснай хворым, але каб вылечыць і сваю душу (дваістасць памкненняў); Еўфрасіння лечыць пракажоных у Галілейскім шпіталі, хаця гэта не ёсць мэта яе падарожжа. Ігуменне робіць гэта толькі таму, што сустрэла іх на сваім шляху і што хрысціянская мараль не дазваляе ёй адвярнуцца ад тых, каму патрэбная яе дапамога: *«Тады ўбачыла ўвесь шпіталь – усіх гэтых, жыццём і людзьмі адрынутых, дзяцей Божых. І тут жа адчула далонямі гарачыя штуршкі ад гнайнікоў паланянкі, яшчэ раз прыплюшчыла вочы. Пачала малітву, і моцная гарачая сіла пайшла з яе далоняў у чужыя раны... Важкая, як ртуць, стомленасць, пачала расцякацца па ўсёй спіне, але яна ўсё малілася і малілася...»*. Галоўных гераінь лучыць і ідэйная накіраванасць твораў, якая праз іх вобразы ўвасобілася і якую агучыла В.Локун: «Як адну з галоўных у працэсе гісторыка-культурнага фармавання гуманістычных прыярытэтаў аўтарка вылучае ідэю хрысціянскай этычнай духоўнасці. Да гэтай ідэі яна наблізілася яшчэ ў рамане «Крыж міласэрнасці». Але – толькі наблізілася... Ідэя хрысціянскай самасвядомасці як асновы духоўнага абнаўлення зямлі беларускай загучала дамінантна ў рамане «Пакліканыя».

У свой час А.Сямёнава адзначала, што ў прозе В.Коўтун «усё па максімалісцкай сістэме каштоўнасцяў», таму не выпадкова яе гераіні вызначаюцца надзвычай сур’ёзным стаўленнем да жыцця. Так, ім характэрна пачуццё гіперадказнасці за сваю краіну: Еўфрасінні – за лёс Полацкай зямлі, Цётцы – за лёс Беларусі. Пачуццё гіперадказнасці мяжуе з не менш характэрным для жанчын увогуле і гераінь раманаў у прыватнасці пачуццём віны, якое часам перарастае ў безадказнасць у адносінах да сябе саміх, у самаахвяраванне, пастаяннае самапераадоленне. Адказ ад кахання – адно з праяўленняў такой гіперадказнасці, калі першае (у дадзеным выпадку клопат пра Радзіму, вернасць выбранаму шляху) перашкаджае другому (каханню да чалавека супрацьлеглага полу). Няўменне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сумяшчаць грамадскае і асабістае характэрна гераіням абодвух раманаў, чаго нельга сказаць пра лірычную гераіню паэзіі В.Коўтун. І Цётка, і Еўфрасіння вызначаюцца надзвычай крытычным стаўленнем да сябе, самы строгі суддзя для іх – сваё сумленне. Яны самі вызначаюць для сябе межы дазволенага, самі караюць сябе: адзінотай, уцёкамі ад сябе, працаю, постам, бяссоннем, вярыгамі...

Звяртае на сябе ўвагу падкрэсленая выбранасць гераінь і адначасна змешчаныя ў рамане аспрэчванні выбранасці / пакліканасці якія, мабыць, варта ўспрымаць як выпрабаванні, што выпалі на долю гераінь. Еўфрасіння ўвесь час вядомая звышсілай, а не сваёй воляй і тым больш не пачуццямі, пра што сведчыць і назва рамана. Пакліканасць у дадзеным выпадку якраз і падкрэслівае сувязь твора з жанрам жыція. Цётка таксама «нясе свой крыж», крыж міласэрнасці. Яе будучае ў творы агучвае мадам Жаліхоўская, падкрэсліваючы выбранасць гераіні: яна не магла загінуць раней часу (на Егіпецкім мосце ў Пецярбургу), не выканаўшы ў жыцці тое, дзеля чаго яна прыйшла ў гэты свет. Назвы абодвух раманаў сведчаць пра велічнасць жыццёвага шляху і ігуменні, і знакамітай паэткі, перадаюць яго наканаванасць. Тэксты ж часта гэтую наканаванасць і велічнасць аспрэчваюць. Вялікае месца ў развіцці сюжэту твора адводзіцца выпадку, абставінам, што адыгрываюць немалую ролю ў жыцці гераінь: сумяшчэнне велічнага і прыземленага, абсурднасць сітуацыі, нават жыцця, ўзнікае пры знаёмстве з тэкстамі. В.Локун, маючы на ўвазе раман «Пакліканыя», зазначыла наступнае: «В.Коўтун з самага пачатку адмовілася ад ідэалізацыі сваёй гераіні. Яна – спрэс проціборства зямнога і духоўнага. Зямное, цялеснае моцна трымала яе ў сваім палоне, але яна ўпарта адмаўлялася ад усіх радасцей зямных, бо «іншае маю зрабіць». Гэтыя словы, на наш погляд, слушныя і ў адносінах да рамана «Крыж міласэрнасці».

**2 Тапалогія і гендарнасць другарадных жаночых вобразаў у раманах пісьменніцы.**

Гераіні В.Коўтун, да ўсяго, натуры рызыкоўныя, адчайныя, заўсёды знаходзяцца ў цэнтры падзей, нават самых небяспечных: Еўфрасіння (і Вольга) ідзе да паганскага капішча, лечыць пракажоных у Галілейскім шпіталі; Алаіза хавае лістоўкі, выратоўваючы ад жандараў амаль незнаёмых людзей, што далі ёй прытулак на адну ноч, дапамагае людзям ратавацца ад пажару, працуе сястрой міласэрнасці ў тыфозных бараках і інш.). Яны – заўзятыя падарожніцы: у Еўфрасінні падарожжа адно, затое маштабнае, асабліва калі ўлічваць час, у якім яна жыла. Астатнія паездкі назваць падарожжамі цяжка. А гэта наведванне Заслаўя, капішча, рух паміж сяльцом і Полацкам, паездкі да нянькі і каваля. Вольга, акрамя таго, што паломнічала разам з Еўфрасінняй, многа падарожнічала за межамі полацкай зямлі, будучы соцкім купецкай варты. Што да Цёткі, то яе мы назіраем і ў Пецярбургу, і на малой радзіме, і ў Вільні, і ў Кракаве, і на лячэнні ў Закапанэ, і ў падарожжы па Еўропе. Форма падачы матэрыялу праз разважанні і ўспаміны гераінь акурат стасуецца з дарогай, і, да ўсяго, надае творам большую філасафічнасць.

Гераіням В.Коўтун характэрна запозненае шкадаванне аб страчаным каханні. Спачатку яны парываюць, не разабраўшыся, з каханымі (або ўмешваецца яго вялікасць выпадак), потым усё жыццё шкадуюць аб гэтым і, зберагаючы пачуццё ў сваёй душы, жадаюць вярнуць каханага, цягнуць праз усё жыццё цяжар мінулага. Але ўвесь час умешваюцца нейкія жыццёвыя абставіны, таму сустрэча адбываецца

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

толькі ў іншым свеце, па-за жыццём. Узгадаем, душы Алаізы і Андрэя на момант сустрэліся, каб трапіць потым кожная ў сваю сферу, свой круг. У Вольгі з Валодшам, згодна з логікай развіцця сюжэту, сустрэча павінна хутка адбыцца, бо князёўна час ад часу «перамаўляецца» з Валодшам, *«які заўсёды назірае за Вольгаю з-за празрыстых аблокаў»*, чуе яго «далёкае і ласкавае»: «Ла...да...!». Гераіні раманаў умеюць моцна перажываць, але не здольныя выказваць свае пачуцці, бягуць ад іх. Альбо В.Коўтун не ведае, як будаваць сюжэт пры наяўнасці пачуццяў, якіх не было ў сапраўднасці, бо, каб былі, лёс гераінь склаўся б інакш. Альбо пісьменніца спрабуе давесці, што пачуццё кахання не абышло яе гераінь, хоча стварыць іх характары больш поўнымі, яркімі і запамінальнымі. Што да асабістага жыцця Цёткі, то яно быццам змяшчае ў сабе інтымныя адчуванні Еўфрасінні і Вольгі разам узятыя. Так, і першую, і другую жыццё звязвае з некалькімі мужчынамі. Праўда, адносіны паміж Цёткай і яе, так бы мовіць, каханымі (Костусем, Андрэем, Сцяпонасам) больш рэальныя і магчымыя, чым у галоўнай гераіні рамана «Паклiканыя», улічваючы яе, так званую прафесійную дзейнасць. У сваю чаргу каханні гэтых мужчын да Цёткі, як і яе да іх, можна вызначыць па рознаму, адпаведна: першае каханне, каханне-страсць, каханне-разуменне. Што да праяўлення пачуццяў з боку мужчын да полацкай асветніцы, то іх можна класіфікаваць / вызначыць наступным чынам: Кмет Сава і князь Давыд кахаюць ігуменню «на адлегласці», князь-смалянін (няўдала) сватаецца да Прадславы. Пры гэтым кмет Сава кахае Еўфрасінню «непрыкметна», ненавязліва, разумеючы тую адлегласць, што існуе паміж імі. Князь жа Давыд выказвае пажадлівыя адносіны да ігуменні. Калі можна казаць у такой сітуацыі пра узаемнасць, то адносіны полацкай ігуменні, так бы мовіць, цёплымі можна назваць толькі ў адносінах да кмета Савы. Менавіта яго неаднойчы на працягу рамана ўспамінае яна з пяшчотай і адначасна са шкадаваннем і горыччу з нагоды яго заўчаснай гібелі. Напрыклад: *«Але адкуль жа ўведала мянеская юніца пра тое вечнае маўчанне? Пра далёкага кмета Саву, які і дасюль яшчэ ляжыць пад бясконцым дажджом на растоўчанай заслаўскай дарозе. Не варухнецца, захінуты трапяткой памяццю. Так ні разу і не прамовіў ёй словы любасці. Стапнеў, растварыўся ў далечы, адпакутаваў...»*, або: *«Але цяпер, успомніўшы пра Саву, Еўфрасіння міжволі пасумнела»*, ці: *«А можа, яе, Еўфрасінню, сапраўды паклікала ў гэты лес успамінаў душа Савы? Каб нарэшце паспавядацца і паспавядаць. І распытаць аб усім...»*.

У «Крыжы міласэрнасці» Костусь, каханы галоўнай гераіні, здраджвае ёй з сяброўкай Стэфай. Андрэй, даўшы веры аповеду Генісарэцкага пра трагічны выпадак з Алаізай, знаходзіць сабе новую нявесту. У «Пакліканых» язычніцкі вяшчун Валодша здраджвае Вользе з яе пакаёўкай Маўрай, прычым у той час, як князёўна дзень і ноч шукае яго на рацэ, баючыся што ён патануў пасля таго, як, *«страціўшы раўнавагу, паляцеў галавою ўніз, у чорную, бы смала, ваду»*.

У якасці высновы варта зазначыць наступнае: у раманах В.Коўтун, асабліва другім, мы назіраем тое, што Л.Ірыгарэ лічыць адзнакай «жаночай літаратуры», а менавіта, што акт жаночага пісьма «дэцэнтруе сістэму традыцыйных значэнняў». «Асяродкам дзейнасці» абагульненай гераіні становяцца мужчыны і створаны імі свет, а не наадварот, як было традыцыйна ў беларускай (і не толькі) літаратуры. А ў цэнтры твора знаходзіцца жанчына з яе сістэмай ацэнак. Бясспрэчна і тое, што шмат якія ўласныя філасофскія погляды і сваё разуменне падзей і з'яў пісьменнік увогуле (і В.Коўтун у прыватнасці) «укладае ў вусны сваіх герояў. Такім чынам, ён

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

стварае славу сваіх герояў, а яны ствараюць славу пісьменніку» – гэтыя словы Г.Марчука яшчэ адно сведчанне тапалагічнасці разгледжаных намі вобразаў. Бо ўсе яны ў большай ці меншай ступені ёсць адбітак свядомасці аўтаркі раманаў.

Бясспрэчна і тое, што і Алаіза, і Ефрасіння (і Вольга), нягледзячы на рознасць існавання ў часе і прасторы, прызначэнне, надзелены аднолькава моцным характарам. Яны актыўна ўдзельнічаюць, кожная па-свойму, у жыцці грамадства, надзелены незвычайнай духоўнай (боскай ці касмічнай) сілай.

**3 Жанчына і творчасць...** Гэтая тэма хвалявала чалавецтва на працягу многіх стагоддзяў. Не абмінула яе ў творчасці і В.Коўтун: у паэзіі, у раманах «Крыж міласэрнасці» і «Пакліканыя». У апошнім рамане гэта праблема вырашаецца найперш вобразам Еўфрасінні. Менавіта з імем полацкай асветніцы звязваецца вядзенне згубленага, але існаваўшага ў сапраўднасці Полацкага летапісу: *«Здаецца, паклікаў нехта. Адарваўшыся ад летапісу, азірнулася, але келля, якую ўжо запаўняла дзённае святло, была пустая»*. Творчасцю ў той час лічылася і перапісванне кніг. За такім заняткам неаднойчы ў рамане паказана Еўфрасіння: *«Тады, радасная, не астыўшы ад перапісвання Святой Кнігі, пачала спускацца па круцізне...»*, або *«...Еўфрасіння зняможана замерла пасярод скрыпторыя. На стале дагарала свечка. Тады, уздыхнуўшы, села насупраць яе, перагарнула абалонку пергамінаў, узяла ў рукі сціло. Вывела першую літару...»*. І пісанне летапісу, і перапісванне Святой кнігі ўзгадваецца ў рамане між іншым, кароткімі заўвагамі, быццам аўтарка твора не ведала, як гэта падаць ці рабіла гэта наўмысна, пакідаючы магчымасць для домыслаў і фантазій чытачу.

Творчасцю, несумненна, можна лічыць пафасныя, узнёслыя, велічныя малітвы Еўфрасінні, якіх у творы вялікая колькасць. Яны паглыбляюць вобраз галоўнай гераіні рамана, яшчэ раз падкрэсліваюць яе творчыя здольнасці, увогуле аспрэчваюць думку, што сярэдневяковая жанчына самавыяўлялася адно ў прыкладным мастацтве і была захавальніцай народных песен, паходжанне якіх невядома (маецца на ўвазе іх аўтарства, пол аўтара). У малітвах ігуменння выказвае свой боль і пачуцці, свае трывогі і сумненні, просіць літасці ва Усявышняга да сябе, сваіх родных і да ўсёй зямлі полацкай: *«...І жывы ў ласцы Усявышняга, такі міласэрны і бязгрэшны, Заступнік мой і ахова, Бог мой, прыйдзі, Збаўца ад сетак лоўчых і словаў паганых. І пад крылом Тваім спадзяюся, што зброяю ахоўнай будзе ісціна Твая...»*.

Вобраз князёўны Вольгі – яшчэ адно сведчанне таленавітасці і адукаванасці сярэдневяковай беларускай жанчыны. Так, Кісялёва Т.Р., якая даследавала сацыяльны вобраз жанчыны ў культурах свету, сцвярджае, што «пасля трансфармацыі язычніцтва ў хрысціянства побач з мужчынскімі манастырамі з'явіліся і жаночыя. Манашкі былі занятыя якім-небудзь рамяством (часам спецыфічна жаночым – белашвачкі) ці садова-агародніцкай практыкай у сценах манастыра.

Неад'емнай прэрэгатывай жаночага ўдзелу ў прафесійнай дзейнасці было мастацтва. Праўда, у розных краінах правы жанчын на занятак тымі ці іншымі відамі мастацтва жорстка рэгуляваліся». Вобраз менскай князёўны, прадстаўлены В.Коўтун, з гэтага боку цалкам апраўданы. Вольга размалёўвае сцены Спаса-Успенскай царквы фрэскамі з выявай самой ігуменні: *«...Ігуменне звыкла скіравалася ў царкву... У храме, відно, гарэла некалькі свечак. Ціха ўвайшла праз дзверы ўнутр і адразу ж змеціла на прысценнай лаве Вольгу...У царкве востра пахла свежай фарбай... Азірнуўшыся, міжволі адхітнулася. З шарай царкоўнай*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*сцяны проста на яе пазірала... яна сама. Дапраўды сама яна»*.

Такім чынам, раманы В. Коўтун «Крыж міласэрнасці» і «Пакліканыя» адыгралі вялікую ролю ў міфалагізацыі беларускай гісторыі. Ужо сам факт існавання ў сучаснай беларускай літаратуры твораў такога маштабу, створаных жанчынай і ў цэнтры якіх знаходзіцца вобраз жанчыны, яшчэ раз пацвярджае таленавітасць беларускіх жанчын, з'яўляецца важкім унёскам у сучасную гістарычную прозу. У раманах прасочваецца «імкненне падаць забароненую традыцыйнай культурай жаноцкасць».

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ